# Receiving Master of Law degree in Canada

*The majority of Belarusian students willing to receive a degree are facing a conundrum of where and how to undergo a course. Initial is the dilemma either to opt for a domestic university or to give preference to a foreign educational establishment. Unfortunately, the choice is in many cases predetermined because of the existing lack of information about the educational opportunities abroad.*

*We bring to your attention an interview with Nasta Kurhanava, Belarusian State University International Relations Department graduate, who is now receiving Master of Law degree in Osgoode Hall Law School of York University, Toronto, Canada. She will touch upon some peculiarities of the Canadian system of law and the priorities of legal education, expose the essence and the structure of an LLM course. The reader will also get to know about the enrolment for the course, its duration and the requirements for receiving the degree.*

**In what way are the Belarusian and Canadian systems of law different?**

Belarus, as well as most European countries, has adopted the so-called Civil Law System or Roman-German civil law. Codified laws constitute the basis of the system, while the function of a judge is limited to construing legislation. A different system is employed in the USA, Canada, Great Britain and some other countries, mostly former British dominions, namely Anglo-Saxon Common Law System. It is founded on judicial precedents, and a judge is primarily guided by previous decisions on similar actions.

**What does LLM stand for and where is it to be received?**

In Europe the holders of Anglo-Saxon LLM (Master of Law) degree are considered to be all-round specialists for LLM programs imply training in the sphere of common law.

It is common knowledge that the most prestigious LLM diplomas are granted in American schools of law. There are about 85 such programs in the USA, each providing education to 20 to 80 students. Extremely popular are the schools of law of Columbia University, Harvard University, Pennsylvania University, Cornell University, Wake Forest University etc. Canada rates second on the best higher education system list — after the USA.

**Why choose exactly Canada for an LLM course?**

There are lots of reasons for receiving higher education in Canada. Firstly, its university diplomas, both of Bachelors and Masters, are recognized all over the world. It is natural that among a hundred universities and university colleges several absolutely best ones are to be found, but with all this there are no backward higher educational establishments in Canada. It is problematic to stand out against such a favourable background, though a peculiar hierarchy does exist for Canadian universities as well. It is compiled by an authoritative periodical Maclean's Weekly Magazine, which publishes university ratings twice a year.

**What is the duration and cost of an LLM program?**

The duration of such a program, hinging on a university, is from 9 to 12 months. It is usually 2 semesters of studying (September to April) and three more months for thesis preparation. Tuition fees vary from 10000 to 25000 US dollars — the more prestigious the university, the higher the program costs. Housing, nourishment, health insurance certificate, books and minor expenses do not belong to the above mentioned sum.

**Are there any grants available to cover tuition fees? How can one get to know about it?**

Considering the present economic situation, it is rather difficult to earn for a Master's Degree program on one's own, that's why it would be optimum to seek for some education grant. While entering any of Master's programs the university will provide you with special grant forms along with the necessary application documents. There are a lot of programs and funds in Canada, granting financial assistance to students. One can even apply for a bank credit to pay for one's education, but the surest way to find a grant is to directly address the university of your choice. All the information as per grants is generally available at the university web site.

# Як атрымаць ступень магістра права ў Канадзе

*Для большасьці беларускіх студэнтаў, што плянуюць атрыманьне пасьлядыплёмнае адукацыі, актуальным стае пытаньне дзе і як гэта рабіць. Ужо на першым этапе паўстае дылемат: спыніць свой выбар на айчыннай установе адукацыі альбо вырашыць на карысьць замежнае інстытуцыі. На вялікі жаль, гэтае пытаньне часьцяком рытарычнае з-за недахопу інфармацыі датычна адукацыйных магчымасьцяў іншых краінаў.*

*Вашай увазе прапануецца інтэрвію з Настай Курганавай, абсальвэнткай факультэту міжнародных стасункаў Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, якая зараз атрымлівае ступень магістаркі права ў Osgoode Hall Law School Ёрскага ўнівэрсытэту, Таронта (Канада). Яна распавядзе пра некаторыя асаблівасьці канадзкае сыстэмы права і прыярытэты праўнай адукацыі, раскрые сутнасьць курсу LLM і яго структуру. Вы таксама даведаецеся пра патрабаваньні да тых, хто хоча атрымаць ступень магістра ў галіне права, працягласьць навучаньня і ўмовы, неабходныя для атрыманьня дыплёму LLM.*

**— Перш за ўсё, чым адрозьніваюцца беларуская і канадзкая сыстэмы права?**

— У Беларусі, як і ў большасьці эўрапейскіх краінаў, прынятая гэтак званая Civil Law System або рамана-германская сыстэма цывільнага права, заснаваная на прынятых законах, аб’яднаных у кодэксы. Пры гэтым роля судзьдзі зводзіцца да вытлумачэньня законаў. А ў ЗША, Канадзе, Вялікай Брытаніі і шэрагу іншых дзяржаваў, у асноўным гэта былыя Брытанскія калёніі, дзейнічае англа-саксонская сыстэма агульнага права, альбо Common Law System. Яна заснаваная на судовых прэцэдэнтах, і ў часе разгляду справы судзьдзя кіруецца ў першую чаргу мінулымі рашэньнямі ў аналягічных справах.

**— Што азначае ступень LLM і дзе яе можна атрымаць?**

— На эўрапейскім кантынэнце носьбіты замежных (англа-саксонскіх) юрыдычных ступеняў LLM (Master of laws, магістар права) лічацца спэцыялістамі-ўнівэрсаламі, бо праграмы LLM дазваляюць вывучыць спэцыфіку менавіта агульнага права.

Ні для каго не сакрэт, што найпрэстыжнейшыя LLM — у амэрыканскіх школах права. У ЗША налічваецца каля 85 праграмаў такога кшталту, кожную зь якіх штогод наведвае ад 20 да 80 студэнтаў. Вялікай папулярнасьцю карыстаюцца школы права пры ўнівэрсытэтах Columbia, Harvard, Pennsylvania, Cornell, Wake Forest і інш. Канада займае другое пасьля ЗША мейсца ў сусьветным рэйтынгу сыстэмаў вышэйшае адукацыі.

**— А чаму лепей праходзіць курс LLM менавіта ў Канадзе?**

— Атрымліваць вышэйшую адукацыю ў Канадзе мае сэнс шмат зь якіх прычынаў. Гэта адна з краінаў, чые ўнівэрсытэцкія дыплёмы, як бакаляўрскія, гэтак і магістарскія, прызнаюцца ўва ўсім сьвеце. Сярод сотні ўнівэрсытэтаў і прыроўненых да іх каледжаў, натуральна, ёсьць свае безумоўныя лідэры, але пры гэтым — цяжка паверыць, але тое факт! — няма аўтсайдэраў. На гэткім збольшага добрым фоне цяжка вылучыцца, тым ня менш, своеасаблівая “табэль аб рангах” існуе і для канадзкіх вышэйшых навучальных установаў. Яе складае аўтарытэтны часопіс Maclean’s Weekly Magazine, які два разы на год публікуе рэйтынгі ўнівэрсытэтаў.

**— Цікава, на які тэрмін разьлічаны курс LLM і колькі ён каштуе?**

— Што да працягласьці і кошту такіх праграмаў, дык у залежнасьці ад установы праграма LLM доўжыцца ад 9 да 12 месяцаў. Звычайна, гэта два сэмэстры аўдыторных заняткаў (зь верасьня па красавік) і тры месяцы — напісаньне дысэртацыі. Кошт навучаньня вагаецца ад 10 да 25 тыс. даляраў: чым прэстыжнейшая ВНУ, тым даражэйшая праграма. У большасьці выпадкаў гэты кошт не ўключае аплату за жыльлё, харчаваньне, мэдычную страхоўку, неабходную літаратуру і штодзённыя выдаткі.

**— Для беларускіх студэнтаў вельмі актуальным будзе пытаньне, ці можна атрымаць стыпэндыю на пакрыцьцё кошту навучаньня. Калі так, дык як пра яе можна даведацца?**

— У сёньняшніх эканамічных умовах самому зарабіць на магістарскую праграму даволі цяжка,

**What are the academic requisites to apply for an LLM program?**

One of the major requests of Canadian law schools is that the applicants possess higher legal education. The entrance examination board of any law school notes diploma grades, work experience in legal sphere and the presence of scientific research or publications. Moreover, there is a mandatory requirement, which is writing several essays on the given topic, presenting letters of recommendation and characteristics. The request of no little importance is writing grounding for and orally defending your future thesis topic.

Test of English as a Foreign Language (TOEFL) is also a must. While studying one has to deal with juridical terms, that's why the grade is to be no less than 85-90%. In some schools the applicants are to take a law test LSAT. The test is meant to define the candidate's proficiency in law and the maturity of his/her legal thinking.

**The approaches to legal education are obviously dissimilar in Belarus and Canada. How can it be accounted for?**

The methods of juridical education in Belarus and North America are essentially different. The so-called "Socrates' method" is dominant in North America. That means that lectures are delivered in a form of an open dialogue: any student can ask a question any time, the lecturer also poses questions to students. This is so due to a fundamental difference in the approach to legal education in Belarus and North America. In Belarus the lecturer exposes the meaning of legal norms. A North American professor urges the students to reveal the sense of legal norms themselves grounding on the material studied (it is implied and requested that students prepare 150 to 300 pages for every lecture, the material is not merely to be read but examined through and through, highlighting the key issues and, probably, preparing a case brief etc.). American students (in contrast to Belarusian ones), as a rule, do not study the norms of concrete laws, but some more general legal provisions, acquire the skills of handling legal information as a whole. Specialisation and studying the norms of particular laws is conducted during bar admission course.

**Where is this difference rooted?**

The conceptual difference between legal education in Belarus and North America partially lies in the specific character of common law system functioning. Within the latter the leading role is allotted to a juridical precedent and would-be lawyers should be competent in the stratagem of court decision texts. But the difference is not confined to this very issue. The core concept of legal education in Belarus seems to be grounded in the Soviet teaching practice. Soviet jurisprudence had several peculiarities, including the absence of contract and commercial law. Standard forms were utilized to conclude contracts, the disputes being settled by state arbitration. Thus, lawyer's work was mainly confined to the knowledge of appropriate forms, instructions and the rules of their application, which were not altered for ages. A Canadian lawyer should not only be familiar with the applicable norms, rules, forms etc., but be able to implement them with maximum benefit for the client (remaining within the bonds of law, of course). Canadian legislation (primarily in the realms of commercial, corporate and contract law) is much more flexible than that of USSR. For this reason it is important for a lawyer to master all the existing ways of registering a deal, the advantages and disadvantages of any such form for both sides, possible risks and other attendant circumstances.

**Could you please give us some details about the structure of an LLM course?**

LLM courses are designed for 5 days of studying weekly. The number of studying hours is reduced for the programs precluding thesis writing. The initial nine months are intended for the preparation for thesis, the remaining three — for writing it. The students not entitled to thesis study in a traditional way: they visit lectures and prepare reports.

Normally, a program includes obligatory disciplines and several subjects for the student's choice. The choice is restricted solely by the conflict of several subjects' timetable. Above is an approximate timetable for a year:

1st semester: Legal Theory Alternative Approaches; Corporate Law; Corporate Finance; Securities Legislation (intensive course); Financial Intermediation (investment banking systems, mutual fund, insurance etc.) (intensive course)

2nd semester: Securities Legislation; Intellectual Property; Legislation, regulating show business relations; Drafting Legal Documents.

An LLM course in Canada usually starts with basic principles of Anglo-Saxon law (constitutional law

таму найбольш аптымальны варыянт — шукаць стыпэндыю на навучаньне. Падчас паступленьня на любую магістарскую праграму разам зь неабходнымі заявамі ВНУ прапаноўве Вам спэцыяльныя формы для афармленьня заявы на стыпэндыю. У Канадзе існуе вялікая колькасьць праграмаў і фундацыяў, што фінансуюць студэнтаў. Пры жаданьні вы можаце нават узяць банкаўскі крэдыт на навучаньне, але калі вас цікавіць канкрэтная праграма ў канкрэтным ВНУ, самы надзейны варыянт атрымаць стыпэндыю — зьвярнуцца ў ВНУ. Уся інфармацыя пра ўмовы атрыманьня стыпэндыі найчасьцей выкладзеная на афіцыйным сайце ВНУ.

**— Якім акадэмічным патрабаваньням мусяць адпавядаць тыя, хто хоча прайсьці курс LLM?**

— Наяўнасьць вышэйшай юрыдычнай адукацыі — адно з галоўных патрабаванняў канадзкіх юрыдычных школаў. Падчас паступленьня ў любую юрыдычную школу прыёмная камісія зважае на адзнакі ў дыплёме, досьвед працы па спэцыяльнасьці і наяўнасьць навуковых працаў або публікацыяў. Больш за тое абавязковым патрабаваньнем ёсьць напісаньне эсэ на дадзеную тэму, рэкамэндацыі і характарыстыкі на вас. Яшчэ адно значнае патрабаваньне — пісьмовае абгрунтаваньне і вусная абарона тэмы дысэртацыі, над якой вы зьбіраецеся працаваць.

Іспыт з ангельскай мовы для замежнікаў (TOEFL) — таксама абавязковая ўмова. Падчас навучаньня прыйдзецца мець справу зь юрыдычнай лексыкай, таму бал за іспыт TOEFL мусіць быць ня меншым ад 85—90%. У некаторых школах кандыдатам прыйдзецца здаць і тэст з права LSAT. Ён паказвае ўзровень ведаў у галіне права і разьвітасьць праўнага мысьленьня кандыдата.

**— Відавочна, што падыходы да юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і Канадзе значна розьняцца. Чым гэта тлумачыцца?**

— Мэтады юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і Паўночнай Амэрыцы істотна розьняцца. У Паўночнай Амэрыцы пануе гэтак званы “сакратаўскі мэтад”, то бок лекцыя вядзецца ў рэжыме свабоднага дыялёгу: кожны студэнт вольны ў часе лекцыі задаць пытаньне, лектар гэтаксама можа зьвяртацца да аўдыторыі з пытаньнямі. Гэта зьвязана з карэннай розьніцай у падыходзе да юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і Паўночнай Амэрыцы. У Беларусі на лекцыі прафэсар раскрывае студэнтам значэньне праўных нормаў. У Амэрыцы выкладчык падштурхоўвае студэнтаў да таго, каб яны самастойна раскрылі сэнс праўных нормаў грунтуючыся на вывучаным матэрыяле (патрабуецца, каб да кожнай лекцыі студэнты ўжо вывучылі належны матэрыял, прыкладна 150—300 старонак тэксту, якія неабходна, вядома, ня проста прачытаць, а дэталёва вывучыць, адзначыць ключавыя моманты, магчыма, падрыхтаваць case brief і г.д.). Пры гэтым студэнты ў Паўночнай Амэрыцы (у адрозьненьне ад беларускіх) звычайна вывучаюць ня нормы канкрэтных законаў і іншых нарматыўных актаў, а агульныя палажэньні права, набываюць досьвед працы зь юрыдычным матэрыялам як такім, спэцыялізацыя і зьвязанае з гэтым вывучэньне нормаў канкрэтных законаў ажыцьцяўляюцца падчас курсу падрыхтоўкі да паступленьня ў адвакатуру (bar admission course).

**— На чым грунтуецца такая розьніца?**

— Канцэптуальнае адрозьненьне юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і Паўночнай Амэрыцы часткова зьвязанае з спэцыфікай функцыянаваньня агульнага права, дзе першасным ёсьць юрыдычны прэцэдэнт, і будучым юрыстам неабходна разабрацца ў асаблівасьцях тэкстаў судовых рашэньняў. Аднак адрозьненьні выкліканыя ня толькі гэтым. Падставовая канцэпцыя беларускай юрыдычнай адукацыі палягае ў практыцы выкладаньня савецкага часу. За савецкім часам юрыспрудэнцыя мела шэраг асаблівасьцяў, сярод якіх неабходна найперш падкрэсьліць фактычную адсутнасьць колькі-небудзь разьвітага дамоўнага і камэрцыйнага права. Дамовы паміж паасобнымі прадпрыемствамі заключаліся паводле тыпавых формаў, а спрэчкі вырашаліся дзяржаўным арбітражам. Такім чынам, праца юрыста збольшага зводзілася да веданьня адпаведных формаў, а таксама інструкцыяў і правілаў іх выкарыстаньня, якія не мяняліся цягам гадоў.

У Канадзе для юрыста важна ня толькі ведаць усе ўжыткоўныя нормы, правілы, формы і г.д., але і быць здольным выкарыстаць іх з максымальнай карысьцю для кліента (пры гэтым, вядома, застацца ў рамках закону!). Сыстэма заканадаўства (перш за ўсё камэрцыйнага, карпаратыўнага, дамоўнага права) вылучаецца нашмат большай гнуткасьцю (у параўнаньні з савецкім правам), таму для юрыста важна ведаць ня толькі нейкую адну канкрэтную форму, напрыклад, афармленьня пажаданай угоды, а ўсе магчымыя формы, перавагі і недахопы кожнай такой формы для абодвух бакоў, магчымыя рызыкі і іншыя спадарожныя фактары.

and civil, administrative and criminal legal relationship). Then goes the specialization. An "Intellectual Property" course, for example, comprises copyright, patent law, brand names disciplines. Those interested in Canadian companies' trades should take basic corporate law course. Within its frame the basic principles of international transactions, antimonopoly policy, bankruptcy etc. are dealt with.

It is common for the exams to be in the form of tests. They are taken either at the end of every semester or after a certain course. A task is supplied with several answers that are so similar that it is very easy to choose the wrong one. Profound knowledge is needed to pick the single correct option.

**Is the education received in the West really of such great value for a Belarusian student?**

It is indisputable that western legal education, developing logic and creative problem unfolding on top profitability terms, is of extreme value for modern Belarusian economy. With a view of acquiring these qualities and developing such capacities western legal education is the most advantageous choice. Still, it is necessary to bear in mind that western education gives you as much as you are able to take from it.

**Thanks for finding time to answer our questions. We wish you success in your creative work.**

■ THE QUESTIONS FOR THE INTERVIEW WERE PREPARED BY ALAKSANDAR MARTYNAŬ

KAMUNIKAT.org

**— Распавядзі, калі ласка, пра структуру самога курсу LLM.**

— На LLM заняткі праходзяць штодня, акрамя выходных. На тых праграмах, дзе прадугледжана напісаньне дысэртацыі, колькасьць аўдыторных гадзінаў меншая. Першыя дзевяць месяцаў ідуць на падрыхтоўку да дысэртацыі, астатнія тры — на яе напісаньне. Студэнты, не зьвязаныя працай над дысэртацыяй, навучаюцца паводле традыцыйнае схемы: наведваюць заняткі, рыхтуюць спавешчаньні.

Праграма звычайна ўключае абавязковыя дысцыпліны і шэраг прадметаў на выбар. Магчымасьці выбару абмежаваныя толькі канфліктам раскладаў розных дысцыплінаў. Ніжэй прыведзены расклад на год:

1 сэмэстар: альтэрнатыўныя падыходы да тэорыі права; карпаратыўнае права; фінансаваньне карпарацыі; заканадаўства аб каштоўных паперах (інтэнсіўны курс); фінансавае пасярэдніцтва (інвэстыцыйныя банкаўскія сыстэмы, узаемныя фонды, страхаваньне і г.д.) (інтэнсіўны курс).

2 сэмэстар: заканадаўства аб каштоўных паперах; інтэлектуальная маёмасьць; права, якое рэгулюе індустрыю забаваў; складаньне юрыдычных дакумэнтаў.

Канадзкія LLM пачынаюцца з вывучэньня падставовых прынцыпаў англа-саксонскага права (канстытуцыйнае права і грамадзянскія, адміністрацыйныя і крымінальныя правадачыненьні). Пасьля пачынаецца спэцыялізацыя. Так, напрыклад, у курс “Інтэлектуальная маёмасьць” уваходзяць дысцыпліны з аўтарскага права, патэнтнага права, патэнтнага закону, гандлёвых марак. Тыя, хто цікавіцца ўгодамі з удзелам канадзкіх кампаніяў, мусяць праслухаць курс з падставаў карпаратыўнага права, у межах якога разглядаюцца базавыя прынцыпы міжнародных угодаў, антыманапольная палітыка, банкруцтва і іншыя.

Іспыты звычайна маюць форму тэстаў — здаваць іх трэба напрыканцы кожнага сэмэстру альбо пасьля вывучэньня канкрэтнага курсу. Да заданьня прапаноўваецца некалькі варыянтаў адказаў, вельмі падобных адзін да аднаго, таму памыліцца ў выбары проста. Неабходна мець сапраўды грунтоўныя веды ў прадмеце, каб зразумець, які з адказаў слушны.

**— Ці насамрэч заходняя адукацыя мае такую вялікую вартасьць для беларускага студэнта?**

— Бясспрэчна, што ў новых эканамічных умовах заходняя юрыдычная адукацыя, што дапамагае студэнту разьвіць лёгіку, здольнасьць творча пераасэнсаваць і вырашыць прапанаванае заданьне на максымальна карысных умовах, уяўляе для Беларусі найбольшую каштоўнасьць. З гледзішча набыцьця такога досьведу і разьвіцьця такіх здольнасьцяў заходняя юрыдычная адукацыя і можа быць найбольш карыснай. Аднак самае галоўнае — памятаць, што заходняя адукацыя дасьць вам столькі, колькі вы здолееце ад яе ўзяць.

**— Дзякуй, што знайшла час адказаць на нашыя пытаньні. Посьпехаў табе ў тваіх творчых пачынаньнях.**

■ ПЫТАНЬНІ ПАДРЫХТАВАЎ АЛЯКСАНДАР МАРТЫНАЎ